11. О политических отношениях Беларуси и Китая [Электронный ресурс] // Посольство Республики Беларусь в Китайской Народной Республике. Режим доступа: https://china.mfa.gov.by/ru/bilateral/. Дата доступа: 12.10.2023.

12. Политические отношения [Электронный ресурс] // Посольство Республики Беларусь в Турецкой Республике. Режим доступа: https://turkey.mfa.gov.by/ru/bilateral_relations/political/relations/. – Дата доступа: 12.09.2023.

13. *Тихомиров, А. В.* Состояние политического диалога между Республикой Беларусь и Турецкой Республикой в 1992–2009 гг. // Беларусь – Турция: пути сотрудничества: материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 8 дек. 2009 г. – Минск: Четыре четверти, 2010. – С. 43–47.

14. Турция связала военную операцию России на Украине с действиями Запада [Электронный ресурс] // РБК. 2022. 27 июня. Режим доступа: https://www.rbc.ru/politics/27/06/2022/62b91eb19a79477c247f15ac. Дата доступа: 2.10.2023.

15. *Шадурский, В.* Нужен нам берег турецкий // Беларуская думках. – 2012. – № 4. – С. 21–27.

16. Эрдоган заявил, что конфликт на Украине продлится долго [Электронный ресурс] // Ведомости. 2023. 19 сентября. Режим доступа: https://www.vedomosti.ru/politics/news/2023/09/19/995890-erdogan-konflikt-na-ukraine-prodlitsya-dolgo. Дата доступа: 12.10.2023.

17. Belarus Başbakanı DEIK ev sahipliğindeki yatirim forumu'na katildi [Elektronik kaynak] // DEIK. Giriş türü: https://www.deik.org.tr/basin-aciklamalari-belarus-basbakani-deik-ev-sahipligindeki-yatirim-forumu-na-katildi. Giriş tarihi: 12.10.2023.

18. *Kemaloğlu, İlyas.* Türkiye-Belarus ilişkileri ivme kazanıyor [Elektronik kaynak] // Anadulu Ajansi. 2019. 17 Nisan. Giriş türü: https://www.aa.com.tr/tr/analiz/turkiye-belarus-iliskileri-ivme-kazaniyor/1454764. Giriş tarihi: 15.10.2023.

УДК 4(476)"1918/1926":316.323.72

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БССР ЯК ПРАВАДНІКА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ: МІЖНАРОДНЫ ФАКТАР (1918–1926 гг.)

**М. М. Мязга**

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, вул. Савецкая, 104, 220028, г. Гомель, nmezga@gsu.by*

Важнейшым правадніком сацыялістычнай мадэрнізацыі на тэрыторыі Беларусі стала БССР як савецкая форма беларускай дзяржаўнасці. Пры гэтым станаўленне і развіццё БССР у многім было абумоўлена знешнепалітычнымі ўмовамі. Яны паспрыялі абвяшчэнню БССР ва ўмовах польска-савецкай вайны, яе ўмацаванню як дзяржавы пасля заключэння Рыжскага міру.

***Ключавыя словы:*** БССР; міжнародныя адносіны; сацыялістычная мадэрнізацыя; Рыжскі мір; «узбуйненне» БССР.

# СТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИЦИЕ БССР КАК ПРОВОДНИКА СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ МОДЕРНИЗАЦИИ НА БЕЛАРУСИ: МЕЖДУНАРОДНЫЙ ФАКТАР (1918–1926 гг.)

**Н. Н. Мезга**

*Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины, ул. Советская, 104, 220028, г. Гомель, nmezga@gsu.by*

Важнейшим проводником социалистической модернизации на территории Беларуси стала БССР как советская форма белорусской государственности. При этом становление и развитие БССР во многом было обусловлено внешнеполитическими условиями. Они способствовали провозглашению БССР в условиях польско-советской войны, ее укреплению как государства после заключения Рижского мира.

***Ключевые слова:*** БССР; международные отношения; социалистическая модернизация; Рижский мир; «укрупнение» БССР.

# FORMATION AND DEVELOPMENT OF THE BSSR AS A CONDUCTOR OF SOCIALIST MODERNIZATION IN BELARUS: INTERNATIONAL FACTOR (1918–1926)

**M. M. Miazga**

*Francisk Skorina Gomel State University, Gomel, Sovietskaya st., 104, 220028, s. Gomel, nmezga@gsu.by*

The most important conductor of socialist modernization on the territory of Belarus was the BSSR as a Soviet form of Belarusian statehood. At the same time, the formation and development of the BSSR was largely due to foreign policy conditions. They contributed to the proclamation of the BSSR in the conditions of the Polish-Soviet war, its strengthening as a state after the conclusion of the Riga Peace.

***Keywords:*** BSSR;international relations; socialist modernization; Riga Peace; BSSR “enlargement”.

Усталяванне савецкай улады ў Беларусі азначала пачатак новага, сацыялістычнага, этапу мадэрнізацыі на яе тэрыторыі. Правадніком сацыялістычных пераўтварэнняў стала савецкая форма беларускай дзяржаўнасці ў выглядзе БССР. Яе развіццё шмат у чым вызначала змест, метады, тэмпы сацыялістычных пераўтварэнняў на беларускіх землях. У сваю чаргу працэс савецкага дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі ў значнай ступені залежаў ад знешнепалітычных умоў. У дадзеным артыкуле пастаўлена мэта вызначыць у якой ступені міжнародныя ўмовы ўплывалі на працэс станаўлення і развіцця БССР як дзяржаўнага ўтварэння, у рамках якога ў Беларусі праходзіў працэс сацыялістычнай мадэрнізацыі.

Ужо першае абвяшчэнне БССР было ў значнай ступені абумоўлена міжнароднай сітуацыяй, якая складвалася ва Усходняй Еўропе на мяжы

1918–1919 гг. Бальшавікі разглядалі БССР як прастору для тэрытарыяльных саступак Польшчы з мэтай пазбегнуць з ёй ваеннага канфлікту ў той момант. Ва ўмовах складанай сітуацыі на франтах Грамадзянскай вайны ўраду У. Леніна не патрэбны быў яшчэ адзін, польскі, фронт. У сувязі з гэтым Масква гатовая была ісці на значныя тэрытарыяльныя саступкі Польшчы. Але, зыходзячы з вопыту Брэсцкага міру, за кошт тэрыторый, якія фармальна не з'яўляліся расійскімі. Прадстаўнік ЦК РКП(б) у Беларусі А. Іофе на пасяджэнні Цэнтральнага бюро КП(б)Б 22 студзеня 1919 г. заявіў, што прэтэнзіі польскага імперыялізму могуць быць вырашаны дыпламатычным шляхам, для чаго было неабходна, каб Польшча сутыкнулася з буферамі і для чаго ствралася Беларуская ССР. Далей ён адзначыў, што «неадкладнае ўключэнне Беларускай Рэспублікі ў Савецкую Расію на правах федэрацыі знішчае ўсе выгады ад стварэння буфераў – рэспублік, таму што тады ўсе перамовы вядуцца цэнтральным урадам, гэта значыць, самой Расіі давядзецца непасрэдна прымаць у іх удзел». На пасяджэнні ЦК КП(б) Літвы і Беларусі 5 красавіка А. Іофе заявіў, што «за мір з Антантай можна аддаць Літву і Беларусь» [2, с. 205, 265].

Міжнародныя ўмовы шмат у чым абумовілі рашэнне ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г. перадаць Смаленскую, Віцебскую і Магілёўскую губерні са складу Савецкай Беларусі ў склад РСФСР. Рыхтуючыся да магчымых саступак Польшчы за кошт беларускіх тэрыторый, бальшавікі палічылі неабходным падстрахавацца, каб гэтыя саступкі не апынуліся празмернымі. У выпадку патрабавання Польшчы аб саступцы ўсіх беларускіх зямель прэтэнзіі на Магілёўскую і Віцебскую губерні маглі быць адхіленыя, бо яны станавіліся часткай Расіі. У. Ленін адзначаў, што Беларуская Рэспубліка патрэбна пастолькі, паколькі яна мяжуе з іншымі краінамі. Паколькі Смаленск, Віцебск і Магілёў не мяжуюць, то іх можна выключыць са складу БССР [2, с. 209]. Відавочна, што міжнародныя ўмовы спрыялі абвяшчэнню БССР, а затым значнаму памяншэнню яе тэрыторыі.

Заключэнне савецка-літоўскага дагавора 12 ліпеня 1920 г. фіксавала ліквідацыю ССРЛіБ. Дагавор вызначаў усталяваную ім мяжу як мяжу паміж Літвой і Расіяй [7, с. 29]. Але фактычна ў тыя ж дні шмат у чым пад уплывам міжнародных умоў Масква вярнулася да пытання аб аднаўленні беларускай дзяржаўнасці ў савецкай форме. Ва ўмовах паспяховага наступлення Чырвонай арміі на польскім фронце для бальшавікоў зноў актуалізавалася задача распаўсюджвання сацыялістычнай рэвалюцыі на краіны Еўропы. Беларусь у сілу свайго геаграфічнага становішча ператваралася ў важны плацдарм і калідор для прасоўвання рэвалюцыі на захад. Ва ўмовах руху Чырвонай Арміі па тэрыторыі Беларусі для бальшавіцкага кіраўніцтва важнай станавілася задача забяспечыць падтрымку савецкім войскам з боку мясцовага насельніцтва. Як вынікае з матэрыялаў пасяджэння палітбюро

ЦК РКП(б) 4 мая 1920 г., лідары Савецкай Расіі ўсведамлялі, што сярод беларускага насельніцтва атрымала распаўсюджванне ідэя стварэння ўласнай нацыянальнай дзяржавы [14, с. 22]. Аднаўленне Савецкай Беларусі дазваляла бальшавікам прадставіць Чырвоную армію ў вачах польскага і іншых народаў, на землі якіх яна магла ўступіць, як вызваліцеля прыгнечаных нацый, як гэта адбылося з беларусамі, якія атрымалі сваю дзяржаўнасць, а не носьбітам расійскага імперыялізму ў новых умовах. Як указвалася ў дакладной запісцы ЦБ КП(б)Б у ЦК РКП(б) «Аб тэрыторыі БССР» у красавіку 1923 г., «у перыяд стварэння Савецкай Беларусі пераважную ролю адыгрывалі моманты міжнароднай палітыкі – неабходна было ў процівагу імперыялістычным імкненням Польшчы і жаданням беларускага кулацтва арганізаваць буржуазную Беларускую Рэспубліку пад абаронай Польшчы, супрацьпаставіць Рабоча-Сялянскую Беларусь» [5, с. 191].

З пачаткам мірных перагавораў з Польшчай у жніўні 1920 г. БССР аказалася патрэбнай бальшавікам як элемент у дыпламатычнай «гульні» з палякамі, каб прадстаўляць яе як факт рэалізацыі беларусамі права на самавызначэнне і супрацьдзейнічаць тым самым польскім планам «буферызму». БССР патрэбна была Маскве і як альтэрнатыва БНР. 16 верасня ў лісце кіраўніку савецкай дэлегацыі ў Рызе А. Іофе наркам замежных спраў РСФСР Г. Чычэрын адзначыў неабходнасць паскорыць прыезд У. Ігнатоўскага ў Рыгу на той выпадак, калі, магчыма, польскі бок паставіць пытанне аб прызнанні незалежнасці Беларусі. Тады можна было б прадставіць Савецкую Беларусь як ужо існуючую незалежную беларускую дзяржаву [1, с. 204]. Пасля падпісання прэлімінарнага міру расійскае кіраўніцтва лічыла неабходным захаванне БССР як фармальна самастойнай рэспублікі. 3 лістапада 1920 г. Г. Чычэрын пісаў у палітбюро: «Неабходна, аднак, падкрэсліваць, што як Украіна, так і Беларусь не ўваходзяць у склад РСФСР. Для барацьбы супраць польскага буферызму гэтую сістэму трэба праводзіць з найвялікшай паслядоўнасцю». У гэтым духу быў вытрыманы Дагавор аб ваенным і гаспадарчым саюзе паміж РСФСР і БССР ад 16 студзеня 1921 г. [9, с. 214, 243].

18 сакавіка 1921 г. у Рызе быў падпісаны мірны дагавор паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай – з другога. У арт. 2 дагавора гаварылася, што бакі «паводле прынцыпу самавызначэння народаў, прызнаюць незалежнасць Украіны і Беларусі». Далей гаварылася пра ўсходнюю мяжу Польшчы з Расіяй, Беларуссю і Украінай. Тым самым прызнавалася дзяржаўная граніца БССР на заходнім напрамку. Баларусь фігуравала і ў арт. 3, паводле якога Польшча адмаўлялася на карысць Украіны і Беларусі ад усялякіх правоў і дамаганняў на землі, што размяшчаліся на ўсход ад усталяванай граніцы [7, с. 618–619]. Гэтыя палажэнні Рыжскага дагавора

азначалі, што БССР фармальна набывала статус суб'екта міжнародных адносін. Важным для ўмацавання савецкай формы беларускай дзяржаўнасці было і палажэнне Рыжскага дагавора, якое прадугледжвала ўстанаўленне дыпламатычных адносін паміж РСФСР, УССР і БССР, з аднаго боку, і Польшай – з другога [8, с. 542–543].

Пасля заключэння Рыжскага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Польшчай працягвалася барацьба за дамінаванне ва Усходняй Еўропе. Гэта прымушала Маскву ў дачыненні да БССР праводзіць палітыку, у аснове якой была ідэя надання трываласці БССР як увасабленню беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. І. Сталін і Г. Чычэрын яшчэ з канца 1920 г. прапаноўвалі надаць беларускі характар БССР [4, с. 98, 99]. У лісце Г. Чычэрына ў ЦК РКП(б) ад 30 снежня 1920 г. адзначалася: «Мы павінны ісці насустрач самастойнай плыні ў Беларусі, бо ў адваротным выпадку іншыя ёю авалодаюць» [3, с. 258]. У тагачаснай сітуацыі «іншымі», хто мог паставіць пад свой кантроль беларускі нацыянальны рух, была ў першую чаргу Польшча. Названыя вышэй абставіны далі штуршок працэсу надання нацыянальнага характару беларускай савецкай дзяржаўнасці. Сведчаннем такой палітыкі Масквы па беларускім пытанні стала выступленне І. Сталіна на X з'ездзе РКП(б). Ён адверг тэзіс аб тым, што камуністы штучна насаджаюць беларускую нацыянальнасць, і заявіў аб існаванні самастойнага беларускага народа і яго мовы [6, с. 611].

Важным для правядзення сацыялістычнай мадэрнізацыі на тэрыторыі Беларусі было не толькі захаванне БССР як формы беларускай нацыянальнай дзяржаўнаці, але і тое, што пачалі мяняцца прыярытэты савецкай знешняй палітыкі. Паступова на першы план выходзіла задача стварыць максімальна спрыяльныя ўмовы для эканамічнага аднаўлення савецкіх рэспублік. Да канца 1919 г. Савецкая Расія дабілася рашаючых поспехаў у барацьбе з «белым» рухам і ў той жа час стала відавочна, што спадзяванні бальшавікоў на хуткую сусветную рэвалюцыю не спраўдзіліся. У такой сітуацыі першасная ўвага стала надавацца эканамічнаму аднаўленню краіны, без чаго немагчыма было ўмацаванне савецкай улады. У. Ленін ў верасні 1920 г. адзначаў, што Савецкая Расія гатова была пайсці на нявыгадны мір з Польшчай, бо лічыла гаспадарчую работу больш важнай, чым ваенныя поспехі ў справе вызвалення Беларусі і Украіны [12].

Пасля заключэння Рыжскага дагавора савецкі ўрад імкнуўся да нармалізацыі адносін з капіталістычнымі краінамі дзеля гаспадарчага аднаўлення краіны. На X з'ездзе РКП(б) адзначалася, што «магчымасць новых, заснаваных на дагаворах і пагадненнях, адносін паміж Савецкай Рэспублікай і капіталістычнымі краінамі павінна быць выкарыстана, у першую чаргу, для ўзняцця прадукцыйных сіл Рэспублікі, для паляпшэння ста-

новішча галоўнай прадукцыйнай сілы – рабочага класа» [6, с. 611]. Эканамічная дамінанта ў савецкай знешняй палітыцы праявілася і ва ўмовах падрыхтоўкі да Генуэзскай канферэнцыі. У лютым 1922 г. Г. Чычэрын пісаў У. Леніну: «Нашу знешнюю палітыку мы пастаянна характарызуем як вытворчую палітыку, якая ставіць сабе за мэту спрыяць росту вытворчасці ў Расіі» [13, с. 45]. Новыя тэндэнцыі ў савецкай знешняй палітыцы павінны былі паспрыяць гаспадарчаму аднаўленню савецкіх рэспублік.

Савецка-польскім супрацьстаяннем на беларускіх землях шмат у чым вызначалася палітыка Савецкай Расіі ў адносінах да БССР. Гэта датычыцца і такога важнага для развіцця беларускай дзяржаўнасці патання як вяртанне ў склад БССР усходніх этнічных беларускіх тэрыторый. 1 лютага 1921 г. у бюро КП(б)Б паступіла запіска за подпісам 32 камуністаў Беларусі, у якой ставілася пытанне аб далучэнне да БССР тэрыторый на ўсходзе. Яе складальнікі лічылі, што вяртанне беларускіх усходніх земляў у склад БССР яшчэ больш умацуе варожасць беларускіх працоўных мас у адносінах да буржуазнага ладу Польшчы і адначасова будуць ліквідаваны папрокі ў адрас савецкай улады ў гвалтоўнай русіфікацыі. Такія дзеянні будуць садзейнічаць умацаванню аўтарытэту новай улады, стварэнню ўзорнай БССР як далёка высунутага на захад фарпоста сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Таксама прадугледжвалася рашэнне комплексу праблем, звязаных з развіццём нацыянальнай культуры, адукацыі, надання беларускай мове дзяржаўнага статуту [11, с. 141–142, 143].

Кіраўніцтва БССР і далей, каб дабіцца вяртання ў склад рэспублікі ўсходніх беларускіх тэрыторый, прыводзіла аргументы, звязаныя з міжнародным становішчам. У запісцы НКЗС БССР ад 15 верасня 1922 г. гаварылася: «Паколькі Беларусь будзе прадстаўляць з сябе дзяржаву, якая па свайму геаграфічнаму і палітычнаму значэнню можа быць супрацьпастаўлена такім дзяржавам, як Літва, Латвія ці Польшча, пастольскі яна з’яўляецца ў той жа час магутным прыцягальным цэнтрам для замежнай Беларусі» [9, с. 324]. Ідэя аб міжнародным значэнні «ўзбуйнення» БССР утрымліваецца і ў дакладной запісцы ЦБ КП(б)Б «Аб тэрыторыі БССР» у красавіку 1923 г. [10, с. 32]. Пры прыняцці рашэння аб другім «узбуйненні» БССР праблема адносін з Польшчай таксама мела важнае значэнне. У лісце сакратара ЦК КП(б)Б А. Крыніцкага ў камісію палітбюро па пытанні пашырэння граніц БССР ад 14 жніўня 1926 г. адзначалася, што асноўны рашаючы аргумент за пашырэнне граніц БССР у бліжэйшы час вызначаецца палітыкай Польшчы. Выказвалася апасенне, што рэформы, якія ў адносінах да нацыянальных меншасцяў плануе правесці Ю. Пілсудскі, атрымаюць падтрымку з боку правых беларускіх арганізацый і «вагаючыхся элемен-

таў» у Польшчы. Адзначалася, што частка інтэлігенцыі нават у БССР пачынае вагацца і бачыць у палітыцы Пілсудскага шлях да рашэння беларускага пытання [10, с. 220].

Як бачна, такія напрамкі палітыкі Масквы ў дачыненні да БССР, як беларусізацыя, «узбуйненне», якія ў значнай ступені вызначалі змест сацыялістычнай мадэрнізацыі на тэрыторыі Беларусі, у многім былі абумоўлены міжнароднымі абставінамі.

## Бібліяграфічны спіс


1. *Бароўская, В. М.* Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В. М. Бароўская. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 269 с.

2. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. – Мінск : «Юніпак», 2008. – Т. 1. Ч. 1. – 540 с.

3. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. – Мінск : ЮНІПАК, 2008. – Т. 1. Ч. 2. – 394 с.

4. *Борисёнок, Ю. А.* На крутых поворотах белорусской истории: Общество и государство между Польшей и Россией в первой половине XX века / Ю. А. Борисёнок. – М : ООО «Родина МЕДИА», 2013. – 352 с.

5. Государственные границы Беларуси : сборник документов и материалов : в 2 т. / сост.: В. Е. Снапковский [и др.]. – Минск : БГУ, 2012. – Т. 1 : (март 1917 – ноябрь 1926). – 495 с.

6. Десятый съезд РКП(б) : стенографический отчет. – М. : Госполитиздат, 1963. – 916 с.

7. Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М. : Государственное издательство политической литературы, 1959. – Т. 3. – 723 с.

8. Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М.: Госполитиздат, 1961. – Т. 4. – 807 с.

9. Знешняя палітыка Беларусі : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 10 т. – Мн. : БелНДІДАС, 1997. – Т. 1 : 1917–1922 гг. – 398 с.

10. Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 10 т. – Мн. : БелНДІДАС, 1999. – Т. 2 : (1923–1927 гг.). – 461 с.

11. *Ладысеў, У. Ф.* Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мн. : БДУ, 2003. – 307 с.

12. *Матвеев, Г. Ф.* Польша в советской внешней политике с конца 1919 до 16 июля 1920 года / Г. Ф. Матвеев // Новая и новейшая история. – 2021. – № 3. – С. 130–143 [Электронный ресурс] – Режим доступа : https://nni.jes.su/s013038640014696-3-1. – Дата доступа: 24.01.2022.

13. *Модянов, В. Э.* Россия и Германия: дух Рапалло (1919–1932) / В. Э. Модянов. – М. : Просвещение, 2009. – 176 с.

14. *Снапкоўскі, У. Е.* Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918–2017 гг. / У. Е. Снапкоўскі. – Мн. : БДУ, 2017. – 287 с.